БИБЛИОГРАФИЧЕСКИЙ СПИСОК

1. *Энгельс Ф.* Анти-Дюринг // Маркс К., Энгельс Ф. Соч. 2-е изд. М., 1959. Т. 20. С. 5–342.
2. *Маркс К.* К критике политической экономии. Предисловие // Маркс К., Энгельс Ф. Соч. 2-е изд. М., 1959. Т. 13. С. 1–167.
3. *Келле В. Ж., Ковальзон М. Я.* Исторический материализм // Большая Советская Энциклопедия : в 30 т. / гл. ред. А. М. Прохоров. М., 1969–1978. Т. 10 : Ива – Италики. 1972. С. 570–573.
4. *Чернов А. А.* Международные аспекты развития глобального информационного общества // Дипломатический вестник. 2002. Апрель [Электронный ресурс]. Режим доступа: http://www.mid.ru/bdomp/dip_vest.nsf/99b2ddc4f717c733c32567370042ee43/aa8d04aae57c2016c3256bd700474ef5!OpenDocument (дата обращения: 05.02.2014).
5. Общая теория права и государства / под ред. В. В. Лазарева. М., 2000.
6. *Чубукова С. Г., Элькин В. Д.* Основы правовой информатики : учеб. пособие. М., 2004.
7. Ведение бизнеса – 2013. Разумный подход к регулированию деятельности малых и средних предприятий // Doing Business [Электронный ресурс]. Режим доступа: http://russian.doingbusiness.org/reports/global-reports/doing-business-2013 (дата обращения: 05.02.2014).
8. Беларусь: международные рейтинги и национальная статистика // Информационный бюллетень Посольства от 04.11.2013 [Электронный ресурс]. Режим доступа: http://serbia.mfa.gov.by/ru/embassy/news/f73be7beebfb36ec.html (дата обращения: 05.09.2015).
9. Ведение бизнеса – 2014. Понимание регулирования деятельности малых и средних предприятий // Doing Business [Электронный ресурс]. Режим доступа: http://russian.doingbusiness.org/reports/global-reports/doing-business-2014 (дата обращения: 05.09.2015).
10. Беларусь поднялась на 13 позиций в рейтинге Doing Business // TUT.BY [Электронный ресурс]. Режим доступа: http://news.tut.by/economics/470363.html (дата обращения: 27.10.2015).

Поступила в редакцию 18.09.2015.

***Сергей Александрович Балашенко*** – доктор юридических наук, профессор, заведующий кафедрой экологического и аграрного права, декан юридического факультета БГУ.

*УДК 343(476)(091)*

*С. А. ГУР'ЕЎ*

# ТЭНДЭНЦЫІ СТАНАЎЛЕННЯ І РАЗВІЦЦЯ БЕЛАРУСКАГА КРЫМІНАЛЬНАГА ПРАВА Ў 1920–80-я гг.

Рассматриваются ключевые периоды формирования белорусской советской уголовно-правовой науки, роль отечественных ученых-правоведов в создании белорусской школы уголовного права, перечисляются основные специализированные издания, в которых освещались вопросы уголовно-правового характера. Показываются основные этапы, предпосылки и тенденции трансформации отечественной науки, ее достижения и негативные черты, выявлена взаимосвязь научных знаний, уголовного законодательства и правоприменительной практики, указаны отличия отечественной науки от российской и общесоюзной, а также особенности белорусского и российского уголовных кодексов советского периода. Анализируются причины и последствия нарушения объективных закономерностей развития науки в 1920–80-е гг., отличительные черты функционирования уголовного права в условиях Великой Отечественной войны и результаты последующей демократизации уголовно-правовой политики.

***Ключевые слова:*** уголовное право БССР; уголовные кодексы; уголовно-правовая наука; уголовно-правовая политика; преступление и наказание; тенденции.

In the article are considered the key periods of the formation of the Belarusian Soviet criminal law theory, the role of domestic law science and its contribution in the country's total law theory was marked, domestic legal scientists and their role in creation of Belarusian school of criminal law were indicated, the basic specialized editions, that revealed the criminal law questions were enumerated. The main stages, preconditions and trends in the transformation of the national science, her achievements and negative features were identified, the relationship and influence of scientific knowledge of criminal law and practice were revealed, the differences of domestic science from the Russian national science and the country's total science were accentuated, also the distinguishing features of the Belarusian and Russian criminal codes of soviet period were indicated. The reasons and consequences of violation of objective patterns of development of science in 1920–80s, features of functioning of criminal law in the conditions of Great Patriotic war and results of subsequent democratization of criminal law politics were analysed.

***Key words:*** criminal law of the Belarusian SSR; criminal codes; criminal law science; criminal law policy; crime and punishment; trends.

Беларускае крымінальнае права мае значны заканатворчы вопыт, сваё развіццё атрымала яшчэ ў часы Сярэднявечча. Аб гэтым сведчаць, напрыклад, Статуты ВКЛ XVI ст., асабліва Статут 1588 г., які дзейнічаў амаль да сярэдзіны XIX ст. і меў добра распрацаваныя тэарэтычныя палажэнні адносна паняцця і відаў злачынстваў, складу злачынстваў, мэт і відаў пакарання, інстытутаў саўдзелу ў злачынстве, неабходнай абароны і інш. Наяўнасць такога дасканалага заканадаўства сведчыць аб глыбокіх навуковых ведах распрацоўшчыкаў тагачаснага айчыннага крымінальнага права.

Аднак з другой паловы XIX ст. у беларускіх губернях пачало дзейнічаць толькі расійскае заканадаўства і крымінальна-прававыя даследаванні айчынных навукоўцаў сталі эпізадычнымі. Калі тэрыторыя Беларусі ўваходзіла ў склад Расійскай імперыі, даследаванні ў сферы беларускага заканадаўства не праводзіліся. Менавіта таму сістэмная беларуская тэорыя крымінальнага права ўзнікла толькі пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі і развівалася ў рэчышчы спачатку расійскіх, а потым агульнасаюзных навуковых тэндэнцый.

З утварэннем СССР заканадаўчая кампетэнцыя БССР у сферы крымінальнага права ў рознай ступені была абмежавана агульнасаюзнымі паўнамоцтвамі, што замаруджвала развіццё айчыннага крымінальнага права, не дазваляла самастойна ўносіць істотныя змены ў крымінальнае заканадаўства і прымаць рашэнні ў сферы барацьбы са злачыннасцю. Адпаведна ў рэспубліцы замаруджваліся і ўласныя навуковыя даследаванні.

Нягледзячы на гэтыя абставіны, айчынная навука ў галіне крымінальнага права мела пэўныя адрозненні ад расійскай і агульнасаюзнай, што было абумоўлена некаторымі гістарычнымі асаблівасцямі, сацыяльна-эканамічным і культурным развіццём рэспублікі, а таксама паступовым нарошчваннем яе навуковага патэнцыялу.

Асноўнай задачай правазнаўцаў на пачатковым этапе існавання БССР было стварэнне ўмоў для будучых навуковых даследаванняў, у тым ліку падрыхтоўка навуковых кадраў, заснаванне школ, спецыяльнага заканадаўчага цэнтра, здольнага распрацаваць уласнае крымінальнае заканадаўства, а ў сувязі з гэтым – вырашэнне шматлікіх арганізацыйных і іншых пытанняў.

Адметнай рысай беларускай крымінальна-прававой навукі на этапе станаўлення была інтэнсіўнасць яе развіцця. Усяго за некалькі гадоў была створана беларускамоўная юрыдычная тэрміналогія, з'явілася шмат даследчыкаў у галіне крымінальнага права (В. М. Шыраеў, М. М. Гуткоўскі, А. Быкаў, Г. Юнгерц, А. Ленц, С. Слупскі, М. Хаўкін, М. Розенблюм, Е. Левін, С. Вольфсан, Ф. Жукаў, С. З. Кацэнбоген, І. Барышаў, В. Гінзбург, С. Рахманін, П. Цыніт і інш.), пачала выдавацца спецыяльная навуковая літаратура, адкрыліся навучальныя і навуковыя цэнтры (Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, Інстытут беларускай культуры) і інш. Акрамя таго, у такіх перыядычных выданнях, як «Штотыднёвік савецкай юстыцыі» [1] і «Бюлетэнь аддзела кіравання Гомельскага губвыканкама» [2], рэгулярна друкаваліся аналітычныя і статыстычныя матэрыялы на тэму барацьбы са злачыннасцю.

У 1920-я гг. асаблівую ўвагу айчынныя даследчыкі надавалі наступным пытанням: паняцце віны, вызначэнне злачынства, падставы прыцягнення да крымінальнай адказнасці, суб'ект крымінальнай адказнасці, меры крымінальнай адказнасці і інш. Такога выбуховага росту навуковых даследаванняў не ведала нават Савецкая Расія, навука якой, наадварот, замарудзіла сваё развіццё пасля рэвалюцыі.

У адрозненне ад Расіі на пачатковым этапе існавання БССР у навуковым асяроддзі шырока была прадстаўлена толькі сацыялагічная школа крымінальнага права, таму асаблівай канкурэнцыі з боку іншых школ не адчувалася. Аднак навуковыя дыскусіі ў сферы крымінальна-прававой навукі вяліся досыць актыўна, аб чым сведчаць публікацыі названых навукоўцаў.

Навуковы патэнцыял рэспублікі з улікам гістарычных умоў існавання БССР быў накіраваны ў першую чаргу на вырашэнне найбольш вострых практычных задач: распрацоўку асноў заканатворчага працэсу, вырашэнне пытанняў размежавання рэспубліканскай і агульнасаюзнай заканадаўчай кампетэнцыі, распрацоўку крымінальнага заканадаўства ў кантэксце засяроджання на найбольш распаўсюджаных і характэрных менавіта для БССР злачынствах і г. д. Менавіта таму беларускія навукоўцы, у параўнанні з расійскімі даследчыкамі, менш увагі надавалі агульным крымінальна-прававым пытанням, якія фактычна знаходзіліся ў кампетэнцыі СССР, а таксама тэарэтычнай распрацоўцы фундаментальных асноў крымінальна-прававой навукі.

Асноўнымі характэрнымі рысамі развіцця савецкага крымінальнага права 1920–40-х гг. былі рэвалюцыйнасць і класавасць, бо пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі адбыліся радыкальныя змены ў змесце, структуры і сацыяльных функцыях гэтай навуковай галіны. Нягледзячы на тое што пасля рэвалюцыі крымінальнае права было падвергнута меншым зменам, чым, напрыклад, грамадзянскае, яго трансфармацыю таксама можна ахарактарызаваць як рэвалюцыйную, бо яно з'яўлялася пэўным элементам савецкай дзяржаўнай сістэмы кіравання. Тэндэнцыі ў развіцці крымінальнага права БССР былі абумоўлены сацыяльна-эканамічнай і палітычнай рэчаіснасцю рэспублікі, таму кожны значны гістарычны перыяд Савецкай дзяржавы знаходзіў сваё адлюстраванне ў крымінальна-прававой тэорыі, заканадаўстве і правапрымяняльнай практыцы, уносячы ў іх пазітыўныя або негатыўныя рысы.

У гэты перыяд назіралася парушэнне агульных заканамернасцей развіцця навукі, што выявілася ў парушэнні свабоды навуковай крытыкі і прынцыпу пераемнасці навуковых ведаў, прынцыпу адноснай незалежнасці і самастойнасці навукі, а таксама ўсталяванні дагматычных метадаў навуковага даследавання.

Адзначым, што трансфармацыя беларускай крымінальна-прававой навукі ажыццяўлялася ў шчыльнай узаемасувязі з крымінальным заканадаўствам і крымінальна-прававой палітыкай, таму ў артыкуле прыведзены таксама кароткі аналіз гэтых аспектаў.

Разам з парушэннем заканамернасцей развіцця навукі адбываліся і парушэнні асноўных аб'ектыўных заканамернасцей развіцця крымінальнага права. Так, быў парушаны закон унутранай несупярэчлівасці сістэмы права, бо пры распрацоўцы першага сацыялістычнага Крымінальнага кодэкса (КК) 1922 г. у ім былі штучна сумешчаны дзве супрацьлеглыя прававыя канцэпцыі: у дадатак да класічнага прававога вучэння закон дапоўніўся сацыялагічным і часткова антрапалагічным – гэты канцэптуальны сінтэз рабіў кодэкс сапраўды ўнікальным і непадобным да заканадаўства іншых краін. Але такія захады негатыўна адбіваліся на правапрымяняльнай практыцы, бо згодна з сацыялагічнай канцэпцыяй аб «небяспечным стане асобы» меры сацыяльнай аховы (крымінальнай адказнасці) маглі прымяняцца нават да асоб, якія не здзейснілі правапарушэння.

Характэрнай асаблівасцю тагачаснай крымінальна-прававой палітыкі было таксама пэўнае несупадзенне абвешчанай крымінальна-прававой дактрыны і практыкі яе рэалізацыі, бо побач з прававымі існавалі таксама неправавыя (пазасудовыя) сродкі барацьбы з непажаданымі грамадскімі элементамі.

Тым не менш асобныя прававыя заканамернасці працягвалі дзейнічаць і ў той час. Напрыклад, савецкі заканадаўца абраў такую форму ўдасканалення крымінальнага заканадаўства, як кадыфікацыя, што аб'ектыўна было абумоўлена гістарычнай традыцыяй і знайшло ўвасабленне ў КК 1922 г.

Новы этап у развіцці айчыннай крымінальна-прававой навукі звязаны з прыняццем Крымінальнага кодэкса БССР 1928 г., які стаў першай беларускай самастойна распрацаванай крымінальнай кадыфікацыяй савецкага перыяду. Намаганні айчынных навукоўцаў зрабілі звод законаў 1928 г. адным з найбольш дасканалых у СССР: так, па тэхніцы выкanання ён значна апярэджваў КК РСФСР 1926 г., што сведчыць аб даволі высокім узроўні развіцця крымінальна-прававой навукі і заканадаўства БССР у адзначаны перыяд. Размяшчэнне груп злачынстваў па раздзелах II–VII КК БССР было больш лагічна абгрунтаваным і зручным, чым у адпаведным дакуменце РСФСР (напрыклад, шэраг злачынстваў адной катэгорыі, размеркаваных па розных раздзелах КК РСФСР, у КК БССР 1928 г. былі аб'яднаны ў адзін раздзел).

Меліся адрозненні і ў пераліку крымінальна каральных дзеянняў: КК БССР змяшчаў склады злачынстваў, якіх не было ў КК РСФСР (арт. 104, 110, 147, 202, 230 і інш.), а таксама не крыміналізаваў шэраг дзеянняў, якія былі крымінальна каральнымі ў КК РСФСР (давядзенне да самагубства, схіленне да самагубства, здзяйсненне рэлігійных абрадаў у дзяржаўных або грамадскіх установах і інш.). КК БССР 1928 г. меў адрозненні і па структуры Асаблівай часткі. Гэта сведчыць аб тым, што аб'ектыўны закон непарыўнасці ўдасканалення прававой сістэмы дзейнічаў у БССР, нягледзячы на парушэнне іншых заканамернасцей прававога развіцця.

Пасля прыняцця дакумента ў 1928 г. адразу ж выйшла прысвечанае яму навуковае даследаванне В. М. Шыраева «Крымінальны кодэкс БССР», дзе аўтар вызначаў характэрныя рысы крымінальнага заканадаўства [3]. Таксама КК БССР 1928 г. разглядаецца ў даследаванні А. Жыжыленкі, які асабліва адзначаў дзве асноўныя рысы кодэкса: з аднаго боку, імкненне да спрашчэння пабудовы Асаблівай часткі, а з другога – імкненне да ўзмацнення крымінальнай рэпрэсіі. Аўтар лічыў, што на гэтыя моманты варта звярнуць пільную ўвагу пры пераглядзе КК РСФСР 1926 г. [4, с. 1084]. Палажэнні КК БССР 1928 г. шырока разглядаліся ў агульнасаюзным навуковым друку і атрымалі высокую ацэнку вядучых савецкіх навукоўцаў [5].

Адметнай з'явай у сферы тагачасных прававых даследаванняў сталі «Запіскі аддзела гуманітарных навук. Працы кафедры сучаснага права» – збор артыкулаў па розных галінах юрыдычнай навукі, у тым ліку і крымінальнай, які выйшаў у 1929 г. (аўтары М. О. Грэдзінгер, В. М. Шыраеў, С. Слупскі, Ф. І. Гаўзэ, М. М. Гуткоўскі) [6, с. 4]. Зборнік адлюстроўваў агульныя тэарэтычныя палажэнні крымінальнага права, а таксама разглядаў асобныя практычныя праблемы барацьбы са злачыннасцю. Іх прагрэсіўнасць заключалася ў абгрунтаванні неабходнасці ўжывання прынцыпаў навуковасці, гуманізму, пэўнага дэмакратызму пры распрацоўцы крымінальнага заканадаўства і правядзенні дзяржаўнай карнай палітыкі.

Пачаткам новага этапу ў развіцці айчыннай навукі з'явілася адкрыццё 1 студзеня 1929 г. Беларускай акадэміі навук, створанай на базе Інстытута беларускай культуры, дзе пачаў выдавацца збор навуковых артыкулаў «Запіскі Беларускай акадэміі навук» [7, с. 236].

Перыяд дзеяння КК 1928 г. характарызуецца працягам парушэння савецкімі ўладамі такіх аб'ектыўных прававых заканамернасцей, як умацаванне законнасці, прававых пачаткаў і асноў дзяржаўнага і грамадскага жыцця, што прывяло да значных сацыяльных страт і выдаткаў у выглядзе парушэння законнасці, палітычных рэпрэсій, зніжэння каштоўнасці і аўтарытэту права, прававой культуры, прававога нігілізму. Прычыны гэтага караніліся ў парушэнні базавага прынцыпу рэалізацыі права як умовы яго існавання, бо шматлікія нормы кодэкса былі дэкларатыўнымі і рэальна не дзейнічалі.

Адпаведнасць правапрымяняльнай практыкі нормам КК і панаваўшай крымінальна-прававой дактрыне ў той час назіралася ў асноўным толькі ў дачыненні да агульнакрымінальных злачынстваў. Што тычыцца складу злачынстваў, якія мелі палітычную афарбоўку, то ў гэтым выпадку ў правапрымяняльнай практыцы часта парушаліся абвешчаныя прынцыпы крымінальнага права. Калі ж разглядаць пазасудовую дзейнасць карных органаў БССР, то ні афіцыйнай крымінальна-прававой дактрыне, ні палажэнням КК яна не адпавядала і ў агульную крымінальна-прававую сістэму не ўваходзіла.

У 1930–40-я гг. агульнасаюзнымі пастановамі ў крымінальнае заканадаўства ўносіліся шматлікія змяненні і дапаўненні, якія мелі ў асноўным рэпрэсіўную накіраванасць, паколькі ўводзілі або значна ўзмацнялі крымінальную адказнасць (напрыклад, за крадзеж сацыялістычнай уласнасці, працоўныя парушэнні, спекуляцыю, страту дакументаў і г. д.). Узрастанне ролі агульнасаюзнага крымінальнага заканадаўства прывяло да практычна поўнага згортвання рэспубліканскай крымінальнай заканатворчасці.

Акрамя таго, у канцы 1920-х і асабліва 1930-х гг. у Беларусі пачалася ідэалагічная кампанія па барацьбе з нацыянал-дэмакратызмам і праявамі буржуазнасці, наступствам чаго стала рэпрэсіраванне вучоных, а таксама скарачэнне навуковых даследаванняў. Дыскутаваць на крымінальна-прававыя тэмы і мець адрозны ад існуючага пункт гледжання станавілася ўсё больш небяспечным для навукоўцаў, таму плённыя даследаванні беларускіх юрыстаў прыпыніліся. У перыяд парушэнняў законнасці вялікай патрэбы ў распрацоўцы права не было [8, с. 35].

Асаблівасцю айчыннага крымінальнага права перыяду Вялікай Айчыннай вайны з’яўлялася тое, што ў яго ўносіліся часовыя надзвычайныя нормы, накіраваныя на ўзмацненне абароназдольнасці краіны, якія з заканчэннем вайны былі адменены. Падчас акупацыі БССР на тэрыторыях, што кантраляваліся партызанамі, працягвала дзейнічаць савецкае заканадаўства, хоць яго прымяненне адрознівалася ад практыкі на астатняй тэрыторыі СССР, што было абумоўлена асаблівасцямі дзейнасці і існавання партызанскіх атрадаў.

У гады рэпрэсій і Вялікай Айчыннай вайны беларуская юрыдычная навука панесла вялікія страты, шмат навукоўцаў было рэпрэсіравана, матэрыяльная база для даследаванняў у значнай ступені была знішчана, таму навуковыя пошукі былі моцна замаруджаны або спынены. У сувязі з гэтым пасля вайны прыйшлося нанава ствараць школу крымінальнага права БССР. Пэўным наступствам стала страта пераемнасці паміж навуковымі распрацоўкамі і пакаленнямі даследчыкаў, што негатыўна ўплывала і на тэорыю крымінальнага права. Аднак у жніўні 1944 г. пачаў дзейнічаць Мінскі юрыдычны інстытут, які ў 1954 г. быў пераўтвораны ў юрыдычны факультэт Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, што паспрыяла ўзнаўленню навуковых даследаванняў у галіне крымінальнага права.

У сувязі з тым што з самага пачатку існавання БССР у крымінальна-прававой сферы адбываліся пэўныя парушэнні аб’ектыўных заканамернасцей яе развіцця, нельга было працяглы час іх ігнараваць. Таму заканамерна, што ў 1950-х гг. пачалося паступовае пераадоленне негатыўных рыс папярэдніх перыядаў і вяртанне да асноўных заканамернасцей прававога развіцця.

Згаданыя фактары разам з агульнай дэмакратызацыяй грамадскага жыцця, пашырэннем праў БССР у заканадаўчай сферы пасля ХХ з’езда КПСС, накапленнем значнага нарматворчага досведу прывялі таксама да імклівага развіцця тэорыі крымінальнага права, дзе назіралася паступовае, хоць і няпоўнае, вяртанне да асноўных заканамернасцей яе развіцця, што знайшло адлюстраванне ва ўскладненні структуры крымінальна-прававой навукі, росце навуковай інфармацыі, колькасці навукоўцаў, павелічэнні значэння навукі ў сацыяльнай сістэме і культуры грамадства. Гэта прывяло да павышэння ўзроўню канструявання крымінальнага закона, удасканалення катэгарыяльнага апарату, больш поўнай і дакладнай рэгламентацыі злачынстваў і пакаранняў, іншых пытанняў крымінальна-прававога рэгулявання, ускладнення структуры крымінальнага права.

Як сведчаць архіўныя матэрыялы, падчас зацвярджэння Юрыдычнай камісіяй пры Савеце Міністраў праекта КК БССР 1960 г. паартыкульна абмяркоўваліся ўсе прапановы і заўвагі (усяго паступіла 122 заўвагі на 81 артыкул КК, было прынята 66 прапаноў, 56 – адхілена) [9]. Пры гэтым улічваліся заканадаўства і практыка іншых сацыялістычных дзяржаў. Была выкарыстана найноўшая літаратура па пытаннях крымінальнага права, дзе былі прапанаваны або абгрунтаваны змены і дапаўненні норм савецкага крымінальнага заканадаўства.

Згаданыя навуковыя дасягненні дазволілі распрацаваць КК БССР 1960 г., які меў некаторыя адрозненні ад кодэксаў іншых саюзных рэспублік. Так, новы дакумент не змяшчаў такіх пакаранняў, як ускладанне абавязку выправіць нанесеную шкоду (арт. 32 КК РСФСР), пазбаўленне бацькоўскіх праў (змяшчалася ў большасці саюзных кодэксаў); такіх злачынстваў, як парушэнне правіл здачы дзяржаве золата (арт. 167 КК РСФСР), пашкоджанне марскога кабелю (арт. 205 КК РСФСР) і інш. У адрозненне ад КК УССР беларускі звод законаў меў асобны раздзел «Аб прымусовых мерах медыцынскага і выхаваўчага характару», а ў адрозненне ад КК РСФСР не меў раздзела «Злачынствы, якія складаюць перажыткі мясцовых звычаяў» і інш. Падчас дзеяння КК у яго ўносіліся шматлікія змены, якія (асабліва з абвяшчэннем незалежнасці Рэспублікі Беларусь) прывялі да яго карэннай перапрацоўкі.

Нормы і палажэнні КК БССР 1960 г. увесь час падвяргаліся аналізу даследчыкаў, вынікі гэтых даследаванняў адлюстроўваліся ў агульнасаюзным навуковым друку [10, с. 164]. У 1960–80-я гг. беларускія навукоўцы актыўна займаліся даследаваннямі найбольш важных пытанняў крымінальна-прававой галіны, такіх як падставы крымінальнай адказнасці, злачынствы і прычыны злачыннасці, віна і яе формы, матывы злачынных паводзін, саўдзел, тэарэтычныя асновы кваліфікацыі злачынстваў, множнасць злачынстваў і яе формы, пакаранне і да т. п. Прадпрымаліся спробы выяўляць заканамернасці функцыянавання крымінальнага права ў барацьбе са злачыннасцю, прычыны і ўмовы, якія спрыяюць злачыннасці, распрацоўваліся навуковыя рэкамендацыі па ўдасканаленні дзеючага крымінальнага заканадаўства і практыкі яго прымянення. У гэты перыяд шырока вядомымі сталі даследаванні такіх айчынных навукоўцаў, як І. І. Гарэлік, І. С. Цішкевіч, Е. В. Кічыгіна, М. М. Меркушаў, Я. А. Мацвіенка, С. П. Маргунскі, Л. В. Багрый-Шахматаў, П. А. Дубавец, А. У. Баркоў, В. М. Хоміч і інш. У 1963 г. з удзелам І. І. Гарэліка, М. М. Меркушава, І. С. Цішкевіча, С. Т. Шардыка, Г. Ф. Басава і іншых аўтараў быў падрыхтаваны каментарый да КК.

У гэты перыяд назіралася вяртанне да тэарэтычных праблем вызначэння злачынства, пошуку крытэрыяў па адрозненні злачынных і незлачынных паводзін, якія існавалі яшчэ ў дарэвалюцыйнай прававой думцы [11, с. 74].

У самастойныя галіны прававых ведаў вылучыліся крыміналогія і выпраўленча-працоўнае права, пачалося паглыбленае даследаванне праблемы прычын злачыннасці і асобы злачынца, стала надавацца сур’ёзная ўвага сацыялагічным аспектам крымінальнага права. Навукова-даследчая праца, а таксама практычная дзейнасць па падрыхтоўцы праектаў агульнасаюзных крымінальных законаў істотна спрыяла развіццю савецкай тэорыі крымінальнага права, у прыватнасці навуковай распрацоўцы праблем крымінальнага закона [12, с. 251–252].

Станоўчы ўнёсак беларускага савецкага крымінальнага заканадаўства ў агульнасаюзнае складаўся ў тым, што некаторыя яго нормы служылі прыкладам для шэрагу саюзных рэспублік пры распрацоўцы імі ўласных крымінальных законаў. Крымінальныя кодэксы БССР 1928 і 1960 гг. шырока разглядаліся ў агульнасаюзным навуковым друку і атрымалі высокую ацэнку вядучых савецкіх навукоўцаў.

Такім чынам, нягледзячы на часовыя перапынкі ў развіцці айчыннага крымінальнага права, а таксама яго пэўны рэгрэс і рэакцыйнасць у асобныя перыяды, іншыя недахопы, у цэлым у БССР быў назапашаны безумоўны навуковы і практычны досвед у гэтай галіне. Айчыннае крымінальнае заканадаўства і навука займалі важнае месца ў праававой сістэме СССР і былі аднымі з найбольш дасканалых і развітых.


БІБЛІЯГРАФІЧНЫ СПІС

1. Борьба с преступностью в Белоруссии // Еженедельник советской юстиции. 1924. № 9. С. 4–5.
2. Борьба с преступностью // Бюллетень отдела управления Гомельского губисполкома. 1923. № 2. С. 4–5.
3. *Шыраеў В. М.* Крымінальны кодэкс БССР. Мінск, 1928.
4. *Жижиленко А.* Белорусский уголовный кодекс 1928 г. // Рабочий суд. 1929. № 15/16. С. 1075–1084.
5. *Герцензон А. А., Дурманов Н. Д., Пионтковский А. А., Ромашкин П. С.* Курс советского уголовного права: Уголовный закон : в 6 т. М., 1970. Т. 1 : Часть общая.
6. *Доўнар Т. І.* Зараджэнне айчыннай гісторыка-прававой навукі і яе развіццё ў Беларускім дзяржаўным універсітэце // Весн. БДУ. Сер. 3, Гісторыя. Эканоміка. Права. 2010. № 3. С. 3–9.
7. Гісторыя Беларусі : у 6 т. / А. Вабішчэвіч [і інш.]. Мінск, 2006. Т. 5 : Беларусь у 1917–1945 гг.
8. *Ходзін С. М.* Гісторыя культуры Беларусі ў 1920–1930-я гг. Мінск, 2001.
9. Протоколы заседания юридической комиссии при Совмине БССР (1960 г.) // Нац. арх. Респ. Беларусь. Ф. 1271. Юридическая комиссия при Совете Министров БССР. Оп. 1. Ед. хр. 2. Л. 18–19.
10. *Меркушев М. Н.* Особенности уголовного кодекса Белорусской ССР // Особенности уголовных кодексов союзных республик : сб. ст. / под ред. В. Д. Меньшагина. М., 1963. С. 164–183.
11. *Епифанова Е. В.* Теория преступления в науке уголовного права: исторический аспект и современность : учеб. пособие. Краснодар, 2006.
12. Уголовное право. История юридической науки / Н. Д. Дурманов [и др.]. М., 1978. С. 251–252.


Паступіў у рэдакцыю 01.07.2015.

***Сяргей Аляксандравіч Гур'еў*** – юрысконсульт Белгазпрамбанка.

*УДК 347.72*

*А. В. ЗЕЛИСКО (УКРАИНА)*

## ХАРАКТЕРНЫЕ ПРИЗНАКИ ПРЕДПРИНИМАТЕЛЬСКИХ ЮРИДИЧЕСКИХ ЛИЦ ЧАСТНОГО ПРАВА

Рассматриваются проблемы последовательности и правового регулирования деятельности юридических лиц частного права, основная цель которых – получение прибыли. Установлено, что существующая в сфере деятельности юридических лиц частного права «разносистемность» требует формирования комплекса основных признаков предпринимательских юридических лиц частного права. Эти признаки станут основой для классификационного разделения юридических лиц частного права на типы и виды, повлияв на систему юридических лиц частного права в целом, что позволит привести к единому знаменателю все организационно-правовые формы юридических лиц частного права, направленные на получение прибыли и функционирующие в данное время в разных правовых плоскостях. Формирование признаков предпринимательских юридических лиц частного права было произведено на основании анализа понятия «общество», которое выступает главной правовой конструкцией для этих юридических лиц. В результате исследования установлено, что комплексом признаков предпринимательских юридических лиц частного права являются: сочетание имущественного и личностного компонентов во время функционирования этих юридических лиц; право участия основателей (участников), которое отображается в правовой связи, возникающей между предпринимательским юридическим лицом и его основателем (участником) и обязательно характеризующейся наличием имущественного компонента в виде возникновения у основателей (участников) имущественных корпоративных прав; наличие частного интереса в основе создания и функционирования такого юридического лица, являющегося интересом его основателей (участников), а не третьих лиц; возможность распределения всей прибыли юридического лица между его участниками.

***Ключевые слова:*** юридическое лицо; общество; предпринимательское юридическое лицо частного права; основные признаки; отношения участия.

In the article the problems of legal adjusting of the legal entities of Private Law are described. The main goal of these legal entities are the income. It is established, that activity of the legal entities of Private Law can be characterized by different legal system. This fact requires forming of complex of basic signs of entrepreneurial legal entities of Private Law. These signs will become basis of classification of legal entities of private law on types and kinds. The author has analyzed the general conceptual definition of legislation and science as «company». As a result of research, it is formed the complex of basic signs of entrepreneurial legal entities of Private Law, such as: combination property and personality components during functioning of these legal entities; relations of participation of founders (participants), that is represented in a legal intercommunication between an entrepreneurial legal entity and his founder (participant). This legal intercommunication can be characterized by property corporate rights of founders (participants) of legal entities; private interest of founders (participants) is basis of activity of these legal entities; possibility of distribution of all profit of legal entity between his participants.

***Key words:*** legal entity; company; entrepreneurial legal entity of Private Law; basic signs; relations of participation.

Спецификой современного состояния правового регулирования предпринимательской деятельности юридических лиц частного права выступает полисистемность, возникшая в результате применения Гражданского и Хозяйственного кодексов Украины, а также разветвленной прослойки специализированных